ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУК
“Мастоўская раённая бібліятэка”
Т.І.Стэльмах

________________2025 г.

ПАЛАЖЭННЕ
аб раённым літаратурным конкурсе “Сузор’е казак”

### *1. Агульныя палажэнні*

1.1. Палажэнне вызначае агульны парадак правядзення творчага літаратурнага конкурсу “Сузор’е казак” (далей - Конкурс).

1.2. Арганізатарам Конкурсу з’яўляецца дзяржаўная ўстанова культуры “Мастоўская раённая бібліятэка”.

1.3. Конкурс праводзіцца ў рамках праекта “Беларуская казка: традыцыі і наватарства”.

### *2. Асноўная мэта і задачы конкурсу*

2.1. Асноўная мэта конкурсу - развіццё творчых здольнасцей, у тым ліку ў дзяцей і падлеткаў, і павышэнне прэстыжу чытання.

2.2. Асноўныя задачы конкурсу:

- прыцягненне чытачоў, у тым ліку дзяцей і падлеткаў, да літаратурнай творчасці;
- далучэнне да традыцый, культуры і гісторыі малой радзімы;
- раскрыццё творчых здольнасцей і фарміраванне эстэтычнага густу ўдзельнікаў Конкурсу, іх самавыяўленне.

### *3. Удзельнікі і парадак правядзення конкурсу*

3.1.Конкурс праводзіцца па 2 узроставых групах:

- ад 6 да 10 гадоў;
- ад 11 да 16 гадоў,

3.2. Да ўдзелу ў Конкурсе неабходна накіраваць заяўку па форме (Дадатак 1) і прадставіць матэрыялы ў электронным выглядзе: не больш за 2 друкаваныя аркушы тэксту, шрыфт Times New Roman, памер – 14, міжрадковы інтэрвал – 1.

3.3. Конкурсныя работы прымаюцца да 31 жніўня 2025 года на электронную пошту ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка: info@mostylib.by з паметкай “Конкурс”. Даведкі па тэлефоне: 6-45-01

### *4. Конкурс праводзіцца па намінацыях:*

4.1. Казкі аб жывёлах (птушках), аб дабры і ўзаемадапамогі;

4.2. Казкі аб рыбах Мастоўскага раёна - аб паходжанні, звычках, асаблівасцях;

4.3. Казкі пра гісторыю малой радзімы (г. Масты і Мастоўскага раёна), узнікненне паселішчаў, рэк і азёр, назваў населеных пунктаў, незвычайныя прыгоды ў лесе (на рацэ) і г.д.

***5. Ацэнка вядзецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да афармлення, а таксама па асноўных крытэрыях:***

5.1. Твор павінен быць уласнага сачынення і адпавядаць узросту ўдзельніка конкурсу. Работы могуць быць напісаны прозай або вершаваным складам на беларускай мове. Па жаданні канкурсанта твор можа быць праілюстраваны. У казцы павінны быць: уступ (завязка); асноўнае дзеянне; развязка і эпілог (пажадана); казка павінна вучыць дабру.

***6. Крытэрыі ацэнкі***

6.1. Ацэнка вядзецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да афармлення, а таксама па наступных крытэрыях:
- адпаведнасць намінацыям конкурсу,
- арыгінальнасць аўтарскай ідэі і афармлення,
- творчы падыход.

***7. Тэрміны правядзення конкурсу***

7.1. Конкурс праводзіцца з 07 ліпеня па 31 жніўня 2025 года:
1 этап: з 07 ліпеня па 24 жніўня 2025 года - прыём заявак і конкурсных работ;
2 этап: з 25 жніўня па 31 жніўня 2025 г. - падвядзенне вынікаў.
7.2. Інфармацыя аб праходжанні конкурсу будзе асвятляцца ў сацыяльных сетках установы, у тым ліку на інфармацыйным сайце арганізатара конкурса.
7.3. Матэрыялы, якія не адпавядаюць патрабаванням да конкурсных работ, ці якія паступілі пазней названай даты, разглядацца не будуць.

***8. Для падвядзення вынікаў Конкурсу складаецца журы (Дадатак 2)***

***9. Падвядзенне вынікаў Конкурсу***

Па вынікам Конкурсу журы вызначае пераможцаў – I, II, III месца па кожнай намінацыі.

***10. Далейшае выкарыстанне конкурсных матэрыялаў***

10.1. Дасланыя на Конкурс казкі не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
10.2. Усе ўдзельнікі ўзнагароджваюцца дыпломамі ўдзельніка Конкурсу.
10.3. Пераможцы Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі ў фотарамках і каштоўнымі прызамі на фестывалі “Казка.ВУ” ў верасні 2025 года.
10.5. Арганізатарам даецца права на выкарыстанне конкурсных матэрыялаў у мэтах папулярызацыі кнігі і чытання.
10.6. Арганізатар конкурсу апублікуе творчыя працы канкурсантаў у зборніку казак (тэрмін падрыхтоўкі выдання - снежань 2025 года).

**11. Фінансаванне расходаў на правядзенне Конкурсу** ажыццяўляецца за кошт пазабюджэтных сродкаў: выраб дыпломаў, набыццё фотарамак (для афармлення дыпломаў) і прызоў пераможцам Конкурсу.

Дадатак 1

ЗАЯЎКА
на ўдзел у літаратурным конкурсе "Сузор'е казак"

Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка Конкурсу
(праставіць націск)
___________________________________________________________

Дата нараджэння

Прозвішча, імя, імя па бацьку законнага
прадстаўніка ўдзельніка

Назва твора

Адрас і кантактны тэлефон,
e-mail

З палажэннем аб конкурсе
азнаёмлены
___________________________________________________________

ЗГОДА НА АПРАЦОЎКУ ПЕРСАНАЛЬНЫХ ДАДЗЕНЫХ
Запаўняючы і падпісваючы сапраўдную заяўку на ўдзел у літаратурным конкурсе "Сузор'е казак", я даю згоду на прадастаўленне персанальных дадзеных для апрацоўкі, уключаючы: збор, запіс, сістэматызацыю, накапленне, захоўванне, удакладненне (абнаўленне, змяненне), выманне, выкарыстанне (у тым ліку для індывідуальных зносін з удзельнікам самім у мэтах правядзення трэцімі ліпамі, намечанымі арганізатарам), распаўсюджванне (у тым ліку перадачу трэцім асобам - органам дзяржаўнай улады і арганізацыям, якія забяспечваюць рэалізацыю і правядзенне конкурсу), а таксама ажыццяўленне іншых дзеянняў з персанальнымі дадзенымі, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам. Таксама я даю згоду на размяшчэнне ў сацыяльных сетках, выкарыстанне ў рэкламе і г.д. без выплаты аўтарскага ўзнагароджання.

«___»___________20___г.        _____________        ___________

Дадатак 2

**СКЛАД ЖУРЫ**
літаратурнага конкурсу "Сузор'е казак"

1. Палуйчык Анастасія Валер'яўна – загадчык сектарам культуры Мастоўскага райвыканкама, *старшыня журы Конкурсу.*

2. Стэльмах Таццяна Іосіфаўна, дырэктар ДУК "Мастоўская раённая бібліятэка".

3. Бісерава Вольга Іванаўна – намеснік дырэктара ДУК "Мастоўская раённая бібліятэка".

4. Лагвіненка Таццяна Аляксандраўна – загадчык аддзелам маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы ДУК "Мастоўская раённая бібліятэка".

4. Шэўчык Наталля Аляксееўна – намеснік галоўнага рэдактара газеты "Зара над Нёманам".

5. Калеснікава Таццяна Яўгенаўна – настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдня школа №2 г.Масты імя Героя Савецкага Саюза Васіля Пятровіча Жукава".

6. Ярашук Таццяна Збігнеўна – загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі ДУК "Мастоўская раённая бібліятэка".